# Што? Дзе? Калі?

➡ 15 верасня адзначаецца Дзень бібліятэк Беларусі. Сёлета па ініцыятыве Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі ўпершыню праводзіцца абласная акцыя «Ноч у бібліятэцы», прызначаная на 13 верасня. Наведаўшы гомельскую кніжніцу з 20.00 да 23.00, чытачы патрапяць на «Ноч майстроў», прысвечаную раману Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта». Распачне праграму тэатралізаваны пралог: гасцей будуць сустракаць Майстар і Маргарыта, а таксама Воланд з яго світай. Фотасалон «У Воланда» запрашае сфатаграфавацца з героямі рамана Булгакава ў музеі рэдкай кнігі. У фае першага паверха будзе разгорнута выстаўка катоў «Кот Бегемот і суродзічы». У фае трэцяга паверха новага корпуса бібліятэкі — жаночы салон. «Нядобрая кватэра № 50» для падлеткаў — на цокальным паверсе бібліятэкі. «Дом Грыбаедава» запрашае на сустрэчу з гомельскімі літаратарамі і музыкантамі. Таксама абудзецца адкрыццё персанальнай выстаўкі Сяргея Бохана, баль у Воланда з удзелам студыі тэатра і танца «Livens» і інш. Скончыцца Ноч Майстроў выбарам новай Маргарыты.

➡ Культурна-асветніцкая выстаўка «Марцін Лютэр: 530 гадоў з дня нараджэння» адкрыта ў мабільнай галерэі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Яна падрыхтавана НББ сумесна з грамадскім аб'яднаннем нямецкай культуры «Масты» і прысвечана 530-годдзю «вялікага рэфарматара» Германіі Марціна Лютэра.

У гісторыю нямецкай грамадскай думкі Марцін Лютэр увайшоў і як дзеяч культуры — рэфарматар адукацыі, мовы, музыкі. У экспазіцыі прадстаўлены ілюстрацыйныя і інфармацыйныя матэрыялы. На плакатах можна ўбачыць партрэты Марціна Лютэра і яго жонкі, карціны і гравюры з выявай нямецкага рэфарматара, фотаздымкі месцаў, дзе нарадзіўся і працаваў у розныя часы багаслоў. Зацікавяць наведвальнікаў і здымкі тытульных лістоў выданняў, створаных Марцінам Лютэрам, а таксама ўрыўкі з лістоў і змест яго легендарных 95 тэзісаў супраць індульгенцый.

На ўрачыстым адкрыцці з прывітальнымі словамі выступілі першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алена Далгаполава, намеснік кіраўніка місіі Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Рэспубліцы Беларусь Хольгер Рапіар, намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ламека, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міхаіл Рыбакоў, старшыня грамадскага аб'яднання нямецкай культуры «Масты» Вольга Штокман, біскуп Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Фірысюк. Ганаровыя госці ў сваіх выступленнях адзначылі важкасць асобы Марціна Лютэра ў гісторыі Еўропы, а таксама падкрэслілі ўнёсак пратэстанцкіх плыняў у развіццё культуры Беларусі.

➡ Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага распачала рэалізацыю праекта «Што чытаюць гарадзенцы». У аддзеле абанемента дзейнічае выстаўка кніг, якія найбольш зацікавілі паважаных чытачоў бібліятэкі. Ганаровы грамадзянін Гродна памежнік Рыгор Абялеўскі параіў звярнуць увагу на выданне «Пяць стагоддзяў Гродзенскай мытнай службы», начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі рэкамендуе «Я — сын Ваш» Анатоля Статкевіча-Чабаганава, прафесары Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Святлана Куль-Сільвестрава і Святлана Марозава — адпаведна «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Уладзіміра Караткевіча і «Беларускія летапісы і хронікі» (апошнія выходзілі ў серыі «Беларускі кнігазбор»). Галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Генадзь Мушперт звярнуў увагу на «Аповесці. Апавяданні» Станіслава Гаварухіна, а актрыса Гродзенскага тэатра лялек Аляксандра Літвінёнак — на «Выбранае» Іосіфа Бродскага.

**Даніла АРЦІМОВІЧ**